# СЕКЦИЯ 5. МЕНЕДЖМЕНТ В СИСТЕМЕ ОБРАЗОВАНИЯ

## АНАЛІЗ І САМААНАЛІЗ УРОКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ – ПАКАЗЧЫК ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ НАСТАЎНІКА

**Н. П. Саланевіч, настаўнік**

*ДУА “Сярэдняя школа № 16 г. Пінска”, г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

Правесці поўны аналіз урока ў святле патрабаванняў сучаснай методыкі – справа нялёгкая. Тым не менш, кожны педагог, ідучы на ўрок, павінен дакладна разумець: што ён хоча ад гэтага ўрока. А пасля заканчэння ўрока – што атрымалася.

Рознабаковы або сістэмны аналіз урока дапамагае педагогу ацэньваць свае магчымасці і здольнасці, прагназаваць вынікі вучэбнай дзейнасці і праектаваць усё гэта на далейшую педагагічную дзейнасць.

***Мэта аналізу*** *заключаецца ў выяўленні метадаў і прыёмаў арганізацыі дзейнасці настаўніка і вучняў на ўроку.*

***Асноўнай задачай*** *пры гэтым з’яўляецца пошук рэзерваў павышэння эфектыўнасці працэсу навучання.*

Павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці настаўніка ў многім залежыць ад ступені авалодання ўменнямі аналізаваць сваю дзейнасць і дзейнасць сваіх калег.

*Што ж такое аналіз?* ***Аналіз*** *– гэта лагічны прыём пазнання, які ўяўляе сабой мысленнае раскладанне прадмета (з’явы, працэсу) на часткі, элементы ці прыметы, іх супастаўленне і паслядоўнае вывучэнне з мэтай выяўлення істотных, г. зн. неабходных якасцей і ўласцівасцей.*

Што ж дае аналіз урока настаўніку? У ходзе аналізу настаўнік атрымлівае магчымасць паглядзець на свой урок як бы збоку, асэнсаваць яго як з’яву ў цэлым, мэтанакіравана асэнсаваць сукупнасць уласных

тэарэтычных ведаў, спосабаў, прыёмаў работы ў іх практычным праламленні, ва ўзаемадзеянні з класам і канкрэтнымі вучнямі.

Разам з аналізам урока вельмі важна, каб настаўнік мог рабіць самааналіз, даваць ацэнку ўласнай педагагічнай дзейнасці.

*Што такое самааналіз? **Самааналіз урока** – гэта мысленнае раскладанне праведзенага ўрока на яго складнікі з глыбокім пранікненнем у іх сутнасць, задачы з мэтай ацаніць канчатковы вынік сваёй дзейнасці шляхам параўнання запланаванага са здзейсненым з улікам поспехаў і прасоўвання вучняў.*

Хачу прадставіць  самааналіз адкрытага ўрока, які праходзіў у 9 “А” класе. Урок быў даволі высока ацэнены маімі калегамі і кіраўніцтвам школы. План-канспект дадзенага ўрока быў надрукаваны ў часопісе “Веснік адукацыі”, 2019 г. №8.

**Тэма ўрока:** Мікола Гусоўскі. Паэма “Песня пра зубра” як выдатны твор беларускай літаратуры эпохі Адраджэння.

На вывучэнне паэмы М. Гусоўскага “Песня пра зубра” адводзіцца 2 гадзіны. Вышэйзаяўленая тэма – 1 гадзіна. У раздзеле “Чалавек і грамадства. Постаці айчыннай гісторыі ў беларускай літаратуры” – гэта чацвёртыя вучэбныя заняткі.

**Тып урока:** урок тлумачэння новага матэрыялу. **Від урока**: урок - дыялог з элементамі разважання.

Вучні дадзенага класа мелі трывалыя веды, валодалі літаратурнымі паняццямі, на ўроку заўсёды былі актыўнымі. Дыялог з элементамі разважання дазваліў мне ўключыць у працу кожнага вучня.

Да ўрока была пастаўлена мэта:

— мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні будуць ведаць звесткі пра жыццё М. Гусоўскага, пра гісторыю стварэння паэмы; кампазіцыю твора; сістэму вобразаў паэмы (вобраз зубра, вобраз Радзімы, вобраз М.Гусоўскага, вобраз князя Вітаўта); змогуць правільна зразумець змест паэмы;

— сдзейнічаць удасканаленню навыкаў аналізу ліра-эпічнага твора, уменння бачыць узаемасувязь частак твора; развіваць звязнае маўленне, уменне ацэньваць сваю працу на ўроку;

— спрыяць фарміраванню сістэмы гуманістычных каштоўнасных арыентацый вучняў.

У структуры ўрока можна вылучыць шэсць этапаў:

**1 этап. Арганізацыйны.** Мэта: падрыхтоўка класа да ўрока, арганізацыя ўвагі вучняў.

**2этап. Вучэбная дзейнасць на ўспрыняцце праблемы ўрока.** Мэта: актывізацыя суб'ектыўнага вопыту вучняў; пазнаваўчы інтарэс, наяўнасць матывацыі, самавызначэнне на вынік ўрока. Вырашэнне дадзенай мэты дасягаецца праз зварот да эпіграфа ўрока, знаёмства з планам урока і сумеснае з вучнямі мэтавызначэнне. Уключыць у працу ўсіх вучняў дае магчымасць інструктаж па запаўненні дыктанта з прабеламі, з якім вучні пачынаюць працаваць на наступным этапе, а заканчваюць напрыканцы ўрока, на 4 этапе.

**3этап. Абагульненне і сістэматызацыя ведаў па вырашэнні мэт урока.** Дадзены этап асноўны. Мэта: рашэнне праблемы ўрока з апорай на ўласны вопыт, тэкст, веды па тэорыі літаратуры; пазнаваўчая актыўнасць вучняў.

Ствараю для вучняў праблемную сітуацыю: прапаную паслухаць музычны ўрывак (урывак з оперы “Песня пра зубра” ў выкананні мінскага рок-гурта “Сузор'е”), прашу вучняў падзяліцца ўражаннямі ад праслуханага. Урывак прагучаў на лацінскай мове. Звяртаюся з пытаннем да вучняў, чаму менавіта на лацінскай?

Выклікаць цікавасць да асобы паэта і гісторыі напісання паэмы на дадзеным этапе спрыяюць тэхнічныя сродкі адукацыі (прагляд відэароліка пра паэта і гісторыю стварэння паэмы).

Эўрыстычная гутарка дапамагае вызначыць кампазіцыю паэмы і адметную часавую арганізацыю твора, стварыць уяўленне аб вобразнай сістэме твора.

Пазнаваўчая актыўнасць вучняў актывізуецца шляхам самастойнай працы, працы ў парах.

Для раскрыцця вобраза зубра ў паэме група вучняў рыхтавала індывідуальнае заданне да ўрока, яны бралі інтэрв'ю ў настаўнікаў біялогіі і геаграфіі, якое пасля на ўроку інсцэніравалі. Гэта спрыяла не толькі развіццю творчых здольнасцей, а і сацыяльна-грамадзянскіх кампетэнцый, фарміраванню сістэмы гуманістычных каштоўнасных арыентацый вучняў.

Звяртаюся да вучняў з пытаннем, ці існуе ў наш час дазвол на паляванне на зубра? (Ёсць закон, які рэгулюе паляванне на зубра ў Беларусі. Згодна з Указам Прэзідэнта РБ ад 8 снежня 2005 года №580 дазваляецца паляваць на зуброў рэзервовага генафонду). А што ўключае ў сябе паняцце "рэзервовы фонд"?

Прыём нечаканага адкрыцця вымагае супаставіць дадзеную інфармацыю з тым, што гаворыцца ў паэме і зрабіць вывад (паводле князёў Ягайлы і Вітаўта Белавежская пушча стала запаведнаю).

Вобразу Вітаўту адводзіцца ў паэме значнае месца. Так як з гэтым вобразам вучні сустракаліся на папярэдніх вучэбных занятках і маюць уяўленне аб ім, то мэтазгодным было папярэдняе індывідуальнае заданне групе вучняў (прэзентацыя пра князя Вітаўта. Гістарычны партрэт).

У заключным слове засяроджваю ўвагу вучняў на лёсе паэмы, яе месца ў беларускай літаратуры, увасабленне паэмы ў іншых відах мастацтва.

**4 этап. Самастойная праца з літаратурным дыктантам.**

На дадзеным этапе праз самастойную працу з дыктантам з прабеламі фарміруецца ўменне выкарыстоўваць інфармацыю з розных крыніц (слова настаўніка, відэаролік, паведамленні вучняў, прэзентацыя, вучэбны дапаможнік). Такі прыём дае магчымасць вучням падагульніць тэму ўрока, настаўніку выявіць набытыя вучнямі веды і пракантраляваць іх увагу, зацікаўленасць.

**5этап. Інструктаж да выканання дамашняга задання.**

Ствараю сітуацыю творчых разважанняў.

— Уявіце, што вам трэба распавесці пра Міколу Гусоўскага:

а) недасведчанаму слухачу, які чуе гэта імя ўпершыню,

б)дасведчанаму суразмоўцу, напрыклад аднакласніку.

Заданне: зрабіць два варыянты накідаў сваіх расповедаў.Чым яны будуць адрозніваццa?

**6этап. Рэфлексія. Падвядзенне вынікаў урока.**

Ствараю ўмовы для ўсведамлення вучнямі значымасці вывучанага твора, сітуацыі поспеху. Звяртаюся да вучняў з пытаннямі:

— Што вы сказалі б аўтару паэмы "Песня пра зубра", калі б ён аказаўся побач? — Ці ёсць сярод вас Гусоўскія?

Далей прапаную вучням ацаніць свой "багаж ведаў", які яны атрымалі на канец ўрока. Пры дапамозе рук зрабіць шалі. На адну руку "пакласці" веды, якія былі ў пачатку ўрока, а на другую, веды, якія атрымалі за ўрок. Каменціраванне вучняў спрыяе развіццю ўмення рабіць самаацэнку.

На вучэбных занятках выкарыстаны розныя метады( наглядны, славесны, практычны), элементы тэхналогіі праблемнага навучання. Часткова-пошукавая праца па змесце твора рэалізуецца праз групавую працу з улікам узростава-інтэлектуальных асаблівасцей вучняў. Групавая праца дазваляе вучню памыліцца, вызначыць свае памылкі і атрымаць падтрымку і дапамогу іншых вучняў.

Развіццё пазнавальных інтарэсаў, выхаванне мастацка-эстэтычнага густу і фарміраванне цэласнага светапогляду вучняў, лічу, мэтазгодна на дадзеных вучэбных занятках рэалізаваць праз міжпрадметныя сувязі з вучэбнымі прадметамі "Гісторыя Беларусі", " Геаграфія", " Біялогія", а таксама з такім відам мастацтва, як музыка.

На ўроку выкарыстоўваліся наступныя сродкі навучання: раздатачны матэрыял (карткі-заданні для працы ў парах, літаратурны дыктант з прабеламі для кожнага вучня); тэхнічныя сродкі навучання (запіс фрагмента з оперы "Песня пра зубра" у выкананні мінскага рок-гурта "Сузор'е";

відэаролік); дэманстрацыйнае абсталяванне (план урока, выява Міколы Гусоўскага , князя Вітаўта, зубра, прэзентацыя вучняў).

На мой погляд, структура ўрока, яго змест, метады і прыёмы навучання адпавядалі дадзенаму тыпу ўрока і ўзроставай катэгорыі вучняў. Усё, што планавалася, было засвоена вучнямі, таму я лічу, што ўрок пастаўленай мэты дасягнуў. На наступных вучэбных занятках прадоўжыцца праца з паэмай. Планую даць паслухаць вучням музыку да паэмы М. Гусоўскага ў выкананні гурта "Стары Ольса"і параўнаць з праслуханым музычным творам у выкананні гурта "Сузор'е". Лічу, што вучням будзе цікава прагледзець відэаролік "Пахвала князю Вітаўту" (Гурт "Стары Ольса"). Гэта дапаможа раскрыць вобраз Вітаўта пры напісанні творчай работы.

Трэба адзначыць, што сам па сабе аналіз урока як працэс асэнсавання і самапазнання фарміруе ў настаўніка аналітычныя здольнасці, развівае інтарэс і вызначае неабходнасць вывучэння праблем навучання і выхавання.

Самааналіз – гэта паказчык пафесіяналізму настаўніка, ступені яго асэнсавання задач адукацыі, а не толькі мэт і задач дадзенага ўрока.

Выкарыстаная літаратура:

1. Гоўзіч, І.М. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ/ І.М.Гоўзіч, А.І. Лугоўскі, С.А. Сычова. – Мінск : БДПУ, 2012.
2. Мартынкевіч, С.В. Сучасны ўрок беларускай мовы: тэорыя і практыка навучання : метадычныя рэкамендацыі / С.В. Мартынкевіч. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015 – 53 с.